63. НАРБ. Ф. 63п. Воп. 2. Спр. 554.
64. Панцюхаў ЛКСМБ на павароце: даклад на студзеньскім пленуме ЦК ЛКСМБ аб выніках абсьледаваньня работы комсамолу Беларусі, праведзенага ЦК УсеЛКСМ. Мінск, 1930.
65. НАРБ. Ф. 63п. Воп. 1. Спр. 7.
66. НАРБ. Ф. 63п. Воп. 1. Спр. 10.
67. НАРБ. Ф. 63п. Воп. 2. Спр. 6.
68. НАРБ. Ф. 63п. Воп. 2. Спр. 7.
69. Расійскі дзяржаўны архіў сацыяльна-палітычнай гісторыі (РДАСПГ). Ф. М1. Воп. 23. Спр. 68.
70. РДАСПГ. Ф. М1. Воп. 23. Спр. 115.
71. НАРБ. Ф. 63п. Воп. 1. Спр. 23.
72. Школа мужества и патриотизма. Краткий очерк истории ДОСААФ Белорусской ССР. Минск, 1988.
73. Дваццаць год Ленінскага камуністычнага саюза моладзі Беларусі (гістарычная даведка). Мінск, 1940.
74. ДОСААФ Республики Беларусь: люди, события, факты. Минск, 2007.
75. НАРБ. Ф. 63п. Воп. 2. Спр. 369.
76. НАРБ. Ф. 63п. Воп. 2. Спр. 373.
77. НАРБ. Ф. 63п. Воп. 1. Спр. 108.

**Ходзін Сяргей Мікалаевіч**

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт (Мінск, Беларусь)*

## НАЦЫЯНАЛЬНЫЯ ТРАДЫЦЫІ ЯК ФАКТАР РАЗВІЦЦЯ МАДЭРНІЗАЦЫЙНЫХ ПРАЦЭСАЎ У БЕЛАРУСІ Ў 1920-я гг.

Для разумення пераемнасці розных перыядаў нашай гісторыі выключнае значэнне мае вывучэнне сістэмы каштоўнасцей, звычак, традыцый, рэлігійных і міфічных уяўленняў, а таксама абумоўленых імі форм сацыяльных паводзін. Адпаведнасць сацыяльнай і гаспадарчай практыкі нацыянальным традыцыям спрыяе эканамічнаму поспеху, або яго істотна замаруджвае яго ў выпадках, калі не прымаецца ва ўвагу спецыфіка культуры і гістарычнага вопыту нацыі. Нацыянальныя традыцыі аб'ядноўваюць і мабілізуюць сілы грамадства, арыентуючы іх у кірунку найбольшай эфектыўнасці эканамічнага развіцця. Значэнне нацыянальных традыцый асабліва ўзрастае ва ўмовах мадэрнізацыі грамадства, пад час актывізацыі трансфармацыйных працэсаў. Традыцыя як сацыяльная форма выяўлення агульнага закона пераемнасці валодае ўстойлівасцю, якая дазваляе збіраць культурны вопыт, ажыццяўляць яго перадачу, а дынамічнасць садзейнічае ўзбагачэнню, узаемадзеянню традыцый з іншымі з’явамі грамадскага жыцця. Фарміруючыся на працягу шматлікіх стагоддзяў, традыцыя назапашвае гістарычны вопыт і забяспечвае ўзаемасувязь паміж мінулым і сучасным

Гісторыкі маюць справу не з нейкай абстрактнай чалавечай істотай, а з чалавекам, які жыве пэўным часам, у канкрэтнай мясцовасці, мае свой жыццёвы і генетычна запазычаны вопыт продкаў. Спалучэнне геаграфічнага і гістарычных фактараў утварае пэўныя матывы гаспадарчых паводзін: «пачуццё агульнасці», «пачуццё справядлівасці». У традыцыйным грамадстве роля асобы выяўляецца найперш ва ўмовах адпаведнасці яе дзейнасці пэўным правілам, якія фарміраваліся на працягу стагоддзяў і правяраліся практыкай штодзённага жыцця. Вяртанне да гісторыі як навукі

аб чалавеку дазваляе ўлічыць спосабы, якімі культура ўплывае на чалавечыя паводзіны ўвогуле і эканамічныя паводзіны ў прыватнасці, а таксама садзейнічае разуменню гістарычна склаўшыхся ўяўленняў аб справядлівасці. Аграрныя адносіны нельга акрэсліць толькі як формы зямельнай уласнасці або формы землекарыстання. Іх неабходна асэнсоўваць у цесных стасунках з працоўнай этыкай, з дзейнасцю такіх малых сацыяльных груп, якімі з'яўляецца сям'я. Сацыяльная псіхалогія, эканамічныя паводзіны і іншыя элементы сацыяльна-эканамічных традыцыйных адносін фарміруюцца стагоддзямі і складаюць спецыфіку рэгіянальнага развіцця і нацыянальнага жыцця. Мадэрнізацыйная парадыгма, разам з цывілізацыйнай, дазваляе сцвярджаць тую міждысцыплінарную інтэграцыю, што запатрабавана імкненнем да гісторыі як навукі пра чалавека [1, 2, 3].

Прыроду культуры Ю. М. Лотман разглядае як «негенетычную» памяць калектыву (вопыт калектыву, захаванне папярэдняга вопыту), камунікацыйнае і сімвалічнае адзінства, якое адначасова існуе ў сінхронным і дыяхронным ракурсе. Ён падкрэслівае, што гэтыя вобразы прыходзяць з глыбіні стагоддзяў, змяняюць сваё значэнне і перадаюцца будучым станам культуры [4]. Нацыянальная эканамічная культура можа выступаць і як сукупнасць традыцый, і як складовая частка нацыянальнага менталітэту, што фарміруе яго і ўплывае тым самым на далейшую эвалюцыю грамадства, яго эканоміку, паўсядзённае жыццё, палітыку, ідэалогію. Гісторыкі, услед за філосафамі, маюць на ўвазе пад тэрмінам «культура» пэўную прадметную – матэрыяльную і духоўную – сукупнасць, у якой увасоблены праца і сацыяльныя адносіны людзей, іх уяўленні, ідэалы, веды, нормы і звычаі. Такое разуменне культуры акрэслівае наяўнасць не толькі матэрыяльнай і духоўнай сфер, але і такіх спецыялізаваных элементаў як культура працоўная, палітычная, культура паводзін і інш. Сялянства міжваеннага часу характарызавала нераздзеленасць гаспадарчага, сацыяльнага і культурна-бытавога жыцця, уплыў прыродных цыклаў на эканамічную свядомасць і эканамічныя паводзіны. Духоўнае жыццё, быт сялянства немагчыма зразумець без вывучэння сутнасці сялянскай гаспадаркі як цэласнага арганізма ва ўсёй сукупнасці яе стасункаў з горадам, уладай і г. д. [5]. Згодна Талкоту Парсансу, глыбокімі зменамі з'яўляюцца толькі тыя, што закранаюць сістэму культуры. Эканамічныя і палітычныя перавароты, якія не кранаюць узровень культуры ў грамадстве, не змяняюць самое грамадства ў яго аснове [6].

2018 і 2019 гг. акрэслены 100-годдзем падзей, якія разгортваліся пад уздзеяннем Першага Усебеларускага з'езда. Так сталася, што непасрэднае дзяржаўнае будаўніцтва разгортвалася на савецкай аснове. Выяўляецца надзвычай цікавым пытанне аб тым, у якой ступені беларускай савецкай дзяржавай былі ўлічаны асаблівасці і традыцыі, што назапашваліся стагоддзямі і характарызавалі беларускую нацыю ў папярэдні перыяд. Найбольш значнай для вызначэння тэндэнцый развіцця бачыцца даследаванне сацыяльнай псіхалогіі сялянства і яе ўліку ў палітыцы беларускага савецкага кіраўніцтва. Вёска да сярэдзіны XX ст. – гэта не толькі выключная большасць беларускага насельніцтва, але і сістэма захавання, трансляцыі традыцый нашага грамадства [7].

Ваенныя дзеянні на тэрыторыі Беларусі садзейнічалі агульнаму збядненню насельніцтва. Вынікі апытання, праведзеныя на мяжы 1920–

1921 гг. ва ўсходняй частцы Беларусі сведчаць аб пераважным выбары хутарской формы гаспадарання па той прычыне, што гэта дазваляла адчуць селяніну у найбольшай ступені адчуць сябе гаспадаром. Спроба бальшавікоў захаваць буйныя гаспадаркі праз арганізацыю саўгасаў і камун сустрэла жорсткае супрацьдзеянне вёскі. Бальшавіцкае кіраўніцтва захавала памяць аб гэтых падзеях, што ў далейшым істотна ўздзейнічала на палітыку ў вёсцы. Пазней, у спрэчцы з Д. Ф. Прышчэпавым першы сакратар ЦК КП(б)Б А. І. Крыніцкі заклікаў дзейнічаць больш рашуча ў ажыццяўленні патрабаванняў сялянства, «не чакаць, пакуль заграхочуць Кранштацкія пушкі» [8, арк. 91–97].

У выніку вымушанай адаптацыі тэарэтыкамі бальшавіцкай партыі палажэнняў марксізму да абставін рэчаіснасці краіны з пераважна сялянскім насельніцтвам у 1921–1923 гг склаліся перадумовы для фарміравання нацыянальнай мадэлі мадэрнізацыі. Пагроза новай сялянскай вайны стала вызначальным фактарам паступовага руху да рынавых адносін. Пачатак такой новай эканамічнай палітыкі выявіўся ў беларускіх паветах, што ўваходзілі да ўзбуйнення БССР у склад Расійскай Федэрацыі пад уздзеяннем рашэнняў IX Усерасійскага з’езду Саветаў (снежань 1921 г.). У шасці паветах адроджанай БССР ва ўмовах істотных разбурэнняў і пагранічнага становішча рэалізоўвалася адрозная палітыка. Наркам земляробства БССР А. С. Славінскі, лічыў памылкай ліквідацыю саўгасаў і калгасаў, створаных на аснове былых памешчыцкіх маёнткаў, маючы на ўвазе традыцыйнае размяшчэнне прамысловых прадпрыемстваў у беларускай вёсцы. Адмена надзвычайнага становішча, умацаванне дзяржаўных інстытутаў, падрыхтоўка да ўзбуйнення тэрыторыі БССР выклікалі неабходнасць выпрацоўкі асобнага зямельнага заканадаўства і пашыралі магчымасці для вызначэння альтэрнатыўных падыходаў да мадэрнізацыі [9].

Мадэрнізацыя грамадства вызначаецца як працэс накіраваных сістэмных змен і прадугледжвае дакладна сфармуляваныя мэты, што стаяць перад грамадствам, неабходнасць палітычнай волі і наяўнасць пэўнай групы людзей, якая гэтыя мэты вызначае і рэалізоўвае. У сярэдзіне 1920-х гг., з умацаваннем яе інстытутаў БССР, акрэсліўся фактар, які можна было б назваць фактарам дзяржаўнасці. Інтарэсы рэспублікі як асобнага дзяржаўнага арганізма нярэдка не супадалі з інтарэсамі саюзнага цэнтра і прымушалі рэспубліканскія ўлады прымаць пад ўвагу найперш патрэбы Беларусі, што вызначаліся і ўласнымі інтарэсамі рэспубліканскай партыйна-гаспадарчай эліты, якая складвалася ў гэты перыяд [10].

У савецка-партыйнай гістарыяграфіі надалей менавіта Д. Ф. Прышчэпаў стаў увасабленнем радыкальных падыходаў да рэалізацыі новай эканамічнай палітыкі ў Беларусі. Між тым, высокіх тэмпаў патрабавала партыйнае кіраўніцтва. На Пленуме ЦКК КП(б)Б 3 мая 1925 г. А. І. Крыніцкі сцвярджаў, што ў гаспадарчай палітыцы і практыцы работы на вёсцы занадта шмат перажыткаў «ваеннага камунізму» і найпершай задачай «з’яўляецца цяпер рост накаплення ў весцы, узбагачэння дробнага гаспадара [8, арк. 2, 3]. Д. Ф. Прышчэпаў у спрэчцы з А. І. Крыніцкім падкрэсліваў, што, прызнаючы за селянінам права выбару, дзяржава не можа цалкам адмовіцца ад права заахвочваць тую ці іншую форму землекарыстання. А наконт пераацэнкі кааперацыі пазначаў: «Мы не пераацанілі. Мы недаацанілі. Зараз тэмпы кааперацыі даволі хуткія. Дзяржава ўклала вялікія

сродкі, менавіта таму не трэба кідацца ў крайнасці… Кааперацыя не выключае павышэння таварнасці. Наадварот, гэтыя рэчы ўзаемазвязаныя» [8, арк. 91–97]. Кааперацыя, заснаваная на ўліку працы кожнага з яе ўдзельнікаў, па меркаванню Д. Ф. Прышчэпава, павінна была вырастаць з ініцыятывы вяскоўцаў. І адказваў партыйнаму кіраўніку па сялянску: «Гэта не кармавая рэпа, якую вясною пасадзіш, а восенню яна ўжо вырасла». «На натуральна-спажывецкім фундаменце сялянскай гаспадаркі кааперацыя не будзе развівацца», – сцвярджаў наркам [11, арк. 550, 551]. Між тым, у сярэдзіне 1920-х гг. узрастала спажыванне хлеба самімі сялянамі, павялічваліся выдаткі на корм жывёле. «Такі ўзрост сельскай гаспадаркі, які пакуль што ідзе ў жывот, нас задаволіць ня можа таму, што недахоп прадуктаў сельска-гаспадарчай вытворчасці адаб’ецца на рэканструкцыі ўсяе народнай гаспадаркі», – пісаў Д.Ф. Прышчэпаў у 1928 г. [12, с. 54].

У 1924 і 1926 гг. адбываецца вяртанне ўсходніх беларускіх земляў у склад савецкай рэспублікі. Аб’ядноўваючым фактарам для беларускіх тэрыторый з’яўлялася наяўнасць грамады («зямельнай грамады») як найважнейшага сацыяльнага інстытута. Статыстычныя дадзеныя за першыя гады савецкай ўлады адсутнічаюць, аднак праведзенае на пачатку 1920-х гг. вывучэнне і нарады савецкіх работнікаў паказвалі, што абшчыннае землекарыстанне і найперш перадзелы зямлі ва ўсходняй частцы Беларусі адсутнічалі. Разам з тым, гэта не пацвярджае адсутнасць у значнай частцы шматсямейнага насельніцтва ураўняльных настрояў, якія аднавіліся падчас знаходжання ў складзе РСФСР, дзе абшчыннае землекарыстанне на працягу 1920-х гг. прызнавалася зямельным кодэксам Расійскай Федэрацыі. У падтрыманні сацыяльнай структуры традыцыйнага грамадства, ва ўзнікненні радыкальных ураўняльных і сацыялістычных рухаў заўсёды была заўважнай роля такой эмоцыі як зайздрасць [13]. Рынкавы тып паводзін ствараў шэраг магчымасцей і перспектыў, але для яго рэалізацыі неабходна было выкананне шэрагу ўмоў, як з боку дзяржавы, так і з боку селяніна. Традыцыя, як сутнасць сялянскага жыцця, архаізавала пэўныя формы. садзейнічала марудным зменам ва ўсіх яго сферах, пачынаючы ад вытворчай. У псіхалогіі існуе паняцце інтэрферэнцыі – жыццёвага вопыту, свядомага ці несвядомага, які пры зменах умоў з неспрыяльных на спрыяльнае прадвызначае захаванне негатыўных адносін. Сярод іх у дачыненні да сялянства неабходна пазначыць адносіны да ўлады. Нягледзячы на пэўныя крокі насустрач сялянству, яно захавала пэўны недавер да дзеянняў зараз ужо свайго, беларускага ўрада.

Значнай праблемай для савецка-партыйнай улады з’явіўся пошук апоры, форм сацыяльнай арганізацыі сялянства з мэтай пераходу да калектывізацыі. Павелічэнне колькасці партыйцаў з ліку сялян, а таксама рабочых у першым пакаленні садзейнічала пашырэнню меркаванняў аб тым, што менавіта абшчына утрымлівае парасткі новага сацыяльнага ладу. У сярэдзіне 1920-х гг. у СССР разгортваецца дыскусія аб ролі абшчыны ў трансфармацыі вёскі. Прыхільнікі абшчыны меркавалі, што пры дыктатуры пралетарыяту абшчына, пазбаўленая ранейшых патрыярхальных рысаў, з’яўляецца важнейшым элементам будучага сацыялістычнага грамадства. Супраць такіх сцверджанняў выступіў прафесар М. П. Макараў, які ў асобнай манаграфіі даследаваў аспекты эканамічнай эфектыўнасці

калектыўных гаспадарак БССР у параўнанні з іншымі формамі землекарыстання [14].

З прычыны перавагі сялянскага насельніцтва менавіта ў справе пераўтварэння беларускай вёскі вызначаюцца ўласныя падыходы да мадэрнізацыі. Асабліва заўважнымі з’явіліся адрозненні ў галіне зямельнай палітыкі і зямельнага заканадаўства. Станаўленне дзяржаўнасці прадвызначыла з’яўленне Зямельнага кодэкса, які ствараўся з улікам назапашаных традыцый [18]. Рэалізуючы працоўны прынцып землекарыстання, беларускія кодэксы абмяжоўвалі магчымасці здаваць зямлю ў арэнду пэўнымі ўмовамі і тэрмінамі. У адрозненне ад расійскага, яны не вызначалі прымусовага выдзелу па патрабаванню меншасці, накіраванага, галоўным чынам, супраць абшчыны. Адмова ад ураўняльнага падыходу выяўлялася ва ўстанаўленні максімальных і мінімальных норм працоўнага землекарыстання, захаванні і падтрымцы паказальных («культурных») гаспадарак, адмаўленні абшчыны і вызначэнні функцый грамады. Істотнымі крыніцамі развіцця мадэрнізацыйных працэсаў разглядаліся людскія рэсурсы вёскі і працавітасць беларускага сялянства, якія маглі быць задзейнічаны пры ўмове стварэння спрыяльных умоў для эфектыўнага гаспадарання на зямлі.

Базісным элементам разумення справядлівасці ў беларускага сялянства з’яўлялася праца. Праз адносіны да працы вызначалася разуменне ўласнасці, найперш за ўсё, уласнасці на зямлю, сацыяльны статус чалавека. Менавіта гэты фактар ва ўмовах малаўрадлівай глебы, невысокай аддачы ад укладання сіл у сельскую гаспадарку, складаных прыродна-кліматычных умоў і спецыялізацыі ў кірунку мяса-малочнай жывёлагадоўлі вызначаўся як найважнейшы. На сходах сялянства найчасцей выступала салідарна, сцвярджаючы, што нельга лічыць кулакамі тых, хто стварыў свае набыткі за кошт працы на зямлі [15].

Для разумення гісторыі фарміравання грамадзянскай супольнасці ва Усходняй Еўропе неабходна прымаць да ўвагі той факт, што калектыўная памяць аб зямлі (некалі даступнай усім), мела вырашальнае значэнне ў фарміраванні звычаёвага права. «Народнае разуменне працы і яе права на пазямельную ўласнасць, – пісаў М.В. Доўнар-Запольскі, – рэзка адрозніваецца ад разумення ўласнасці, якое зацвердзілася ў культурных слаях» [16, с. 276]. «Зямля – самы каштоўны прадмет для беларуса, – пісаў М.В. Доўнар-Запольскі. – Ва ўсіх яго шматлікіх абрадах, песнях, казках, якія вызначаюцца старажытнасцю поглядаў, адлюстроўваецца глыбокае пачуццё павагі да зямлі. Зямля звязвалася ў свядомасці селяніна з родам, з вечнасцю, працу на зямлі вясковец лічыў самай значнай. З прычыны розных умоў гаспадарання і перакрыжавання традыцый у Беларусі ў кірунку з усходу на захад усё мацней вызначалася імкненне да індывідуалізацыі, адмаўлення абшчынных форм гаспадарання, ураўняльнага падыходу і г. д. Разам з тым захоўвалася супадзенне ў асноўных падыходах да зямлі як агульнай каштоўнасці, што павінна належаць усяму грамадству. Пры ўсіх разыходжаннях, базавыя дакументы БНР і БССР выяўляюць адзінства ў адмаўленні прыватнай уласнасці на зямлю.

Паказваючы сялянскія ўзаемаадносіны, М.В. Доўнар-Запольскі акрэслівае істотную ролю грамады. Нягледзячы на тое, што традыцыйныя рысы абшчынных адносін, уключаючы перадзелы зямлі як сведчанне

ураўняльнасці, паступова знікаюць, грамада ў Беларусі захоўвала значныя функцыі, акрэсленыя звычаёвым правам, што было ўлічана ў зямельных кодэксах як Расійскай Федэрацыі, так і БССР. Але прынцып ураўняльнасці ў беларускім зямельным заканадаўстве сярэдзіны 1920-х гг. адсутнічаў. Недастаткова мець права на зямлю па нараджэнню, – неабходна, каб гэтае права падтрымлівалася працай», – адзначае М.В. Доўнар-Запольскі і прыводзіць шмат сведчанняў аб тым, што грамада пуставаўшую зямлю надавала таму, хто яе апрацоўваў [17, с. 45–46]. Разуменне такога падыходу мы знаходзім у аграрных праграмах беларускіх партый.

У 1920-я гг. размеркаванне зямлі найчасцей ажыццяўлялася па фактычнаму землекарыстанню. Пэўнае адлюстраванне працоўнага карыстання зямлёй знайшло і ў вызначэнні мінімальнай і максімальнай норм землекарыстання, акрэсленымі наяўнасцю рабочых рук у сям'і. Пры разліку максімальнай нормы меркавалася «пакінуць двару такую колькасць зямлі, каб ён мог апрацаваць яе сіламі сваёй сям'і пры ўмове, што гаспадарка будзе весціся не менш інтэнсіўна, чым дазваляюць натуральныя і эканамічныя ўмовы раёна». Можна сцвярджаць, што «прынцып працы», які зацвердзіўся ў ментальнасці беларусаў як выяўленне справядлівасці, трансліраваўся і на новыя формы гаспадарання.

Акцэнт на прымусовыя метады калектывізацыі абумовіў паступовы адыход ад аплаты працы з улікам той маёмасці («пая»), якая была ўнесена селянінам пры ўступленні ў калгас. Урэшце серадdespite сераднякі апынуліся ў 1930-я гг. у калгасах пад пагрозай рэпрэсій. Аднак, пытанне аб матывацыі станавілася адным з самых істотных ва ўмовах малаўрадлівай глебы, невысокай аддачы ад укладання сіл у сельскую гаспадарку, складаных прыродна-кліматычных умоў і спецыялізацыі ў галіне тэхнічных культур раслінаводства і жывёлагадоўлі пры нізкай ступені механізацыі. Разгортваецца барацьба супраць «лайдакоў» у калгасах. Рэалізуецца і ўдасканальваецца брыгадны прынцып арганізацыі працы, рахункаводства, падрыхтоўка спецыялістаў. Менавіта гэта прадвызначыла параўнальна высокія вынікі гаспадарання калектыўных форм ужо на працягу другой паловы 1930-х гг. Згодна звестак па 13 абласцях, краях і рэспубліках СССР, складзеных на аснове зводных вынікаў бюджэтаў калгаснікаў адной калгаснай сям'ёй у 1935 г. у сярэднім было выпрацавана 462 працадні. У шэрагу абласцей – Ленінградскай, Днепрапятроўскай, Азова-Чарнаморскім і Заходнесібірскім краях выпрацоўка вагалася паміж 500 і 550 працаднямі, а ў БССР перавышала 600 працадзён [18]. Можна меркаваць, што імклівыя тэмпы пасляваеннага развіцця БССР ва ўмовах нізкай механізацыі працы у многім грунтаваліся на прытоку ў горад працалюбівай сялянскай моладзі.

Такім чынам, ва ўмовах тагачаснага беларускага грамадства эканамічная свядомасць насельніцтва перажывала глыбокія змены. З аднаго боку, у эканамічных паводзінах выяўляліся ранейшыя погляды, уяўленні людзей, сфарміраваныя ў часы рэвалюцыйных падзей і аднаўлення абшчынных адносін. З іншага боку, рынкавыя эканамічныя адносіны фарміравалі прынцыпова іншыя погляды і дзеянні. Земляроба заўсёды вызначала асобае стаўленне да прыроды. Ён шмат залежаў ад цыклічнасці развіцця. У фарміраванні часу выяўлялася цесная сувязь рытмаў яго дзейнасці з прыроднымі, тэхналагічнымі і інстытуцыйнымі фактарамі. Выкарыстанне сінергетычнай парадыгмы вызначае прызнанне ўнікальнай

і актыўнай ролі часу ў грамадскіх працэсах. Як усеагульная форма і неад'емны атрыбут існавання сацыяльна-эканамічных працэсаў, час з'яўляецца сістэматворным фактарам, уяўляючы сабой ўніверсальную арганізацыю грамадскага жыцця. Па трапным выразе С. П. Капіцы, у перыяд развіцця мадэрнізацыйных працэсаў мы назіраем пэўнае «сціскане часу»: адбываецца больш хуткі рывок да сучаснасці, але сучасныя сацыяльныя інстытуты і структуры не паспяваюць сфармавацца, ці ж адаптавацца да новых умоў. Змены гістарычных умоў не выклікаюць хуткіх (амаль аўтаматычных) змен у сацыяльнай псіхалогіі сялянства. Гісторыю сёння ствараюць пакаленні, якія сфарміраваліся ўчора, і новай можа быць форма, а змест вызначаецца ўяўленнямі гэтых пакаленняў.

## Бібліяграфічныя спасылкі


1. Ходин, С. Н. «Я из деревни». К вопросу о самосознании белорусов / С. Н. Ходин // Беларус. думка. – 2014. – № 1. – С. 83–89.
2. Ходзін, С. М. Мадэрнізацыйныя працэсы ў Беларусі : трансфармацыя сялянскай псіхалогіі і традыцыйных сялянскіх інстытутаў (першая палова XX ст.) / С. М. Ходзін // Гістарычна-археалагічны зборнік / Ін-т гісторыі НАН Беларусі. – Мінск, 2016. – Вып. 31. – С. 72–78.
3. Ходзін, С. М. Працэсы трансфармацыі беларускай вёскі ў кантэксце тэорыі мадэрнізацыі / С. М. Ходзін // Беларус. гіст. часоп. – 2015. – № 12. – С. 5–11.
4. Лотман, Ю. М. Беседы о русской культуре: быт и традиции русского дворянства (XVIII – начало XIX в.) / Ю. М. Лотман ; сост. альбома ил. и коммент. Р. Г. Григорьева. – СПб. : Искусство-СПБ, 1994. – 399 с.
5. Данилова, Л. В. Природное и социальное в крестьянском хозяйстве / Л. В. Данилова // Крестьяноведение. Теория. История. Современность : ежегодник, 1997 / Моск. высш. шк. соц. и экон. наук. – М., 1997. – С. 34–39.
6. Парсонс, Т. О социальных системах / Т. Парсонс ; под ред. В. Ф. Чесноковой, С.А. Белановского. – М. : Акад. проект, 2002. – 830 с.
7. Ходин, С. Н. Социальные идеалы и изменения в социальной психологии крестьянства Беларуси в 1920-е гг. / С. Н. Ходин // Весн. Беларус. дзярж. ун-та. Сер. 3, Гісторыя. Філасофія. Псіхалогія. Паліталогія. Сацыялогія. Эканоміка. – 2008. – № 1. – С. 13–17.
8. Стенограмма заседания пленума ЦК КП(б)Б от 2–8 мая 1925 г. 104 л. // Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). – Ф. 4п. Воп. 1. Спр. 1992.
9. Ходзін С. М. Этапы савецкай мадэрнізацыі і сацыякультурныя змены ў беларускай вёсцы (1921–1939) // Весн. БДУ. Сер. 3, Гісторыя. Эканоміка. Права. 2016. № 3. С. 32–39.
10. Ходин, С. Н. Аграрная политика в контексте традиций белорусской деревни: компаративные аспекты (первая четверть XX в.) / С. Н. Ходин // Ист. журн.: науч. исслед. – 2015. – № 6. – С. 727–736.
11. Стенограмма X съезда КП(б)Б от 3–10 января 1927 г. 708 л. // НАРБ. Ф. 4п. Воп. 1. Спр. 3083.
12. Прышчэпаў, З. Задачы рэканструкцыі сельскай гаспадаркі ў сёлетнюю пасеўкампанію / З. Прышчэпаў // Совет. стр-во. – 1928. – № 3/4. – С. 53–62.
13. Шек, Г. Зависть: теория социального поведения : пер. с англ. / Г. Шек. – М. : Ирисэн, 2008. – 536 с.
14. Макараў, М. П. Спроба вывучэньня эфектыўнасьці форм землекарыстаньня ў БССР / М. П. Макараў. – Мінск : [б. в.], 1929. – 94 с., 112 с. табл. – (Працы Беларус. навук.-далед. ін-та сельскай і лясной гаспадаркі пры СНК БССР. Аддзел сельскагаспадарчай эканомікі і арганізацыі сацыялістычнай сельскай гаспадаркі ; т. 7, вып. 5).
15. Ходин, С.Н. «Я из деревни». К вопросу о самосознании белорусов / С. Н. Ходин // Беларус. думка. – 2014. – № 1. – С. 83–89.
16. Довнар-Запольский, М. В. Исследования и статьи [Электронный ресурс] / М. В. Довнар-Запольский. – Киев : Тип. 1-й Киев. артели печ. дела, 1909. – Т. 1 : Этнография и социология, обычное право, статистика, белорусская письменность. –

Режим доступа: http://by.ethnology.ru/by_lib/dov-zap_01/graf/dov-zap_01_cont.html. – Дата доступа: 17.01.2016.
17. Довнар-Запольский, М. Очерки обычного семейственного права крестьян Минской губернии / М. Довнар-Запольский // Этногр. обозрение. – 1897. – № 2. – С. 1–16.
18. Хейнман С. Бюджет колхозника. // Правда. 1936. 15 марта.

**Часноўскі Мечыслаў Эдвардавіч**

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт (Мінск, Беларусь)*

## ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСІ САВЕЦКАЙ І СУЧАСНАЙ ЭПОХУ ДЫСЕРТАЦЫЙНЫМ АДЛЮСТРАВАННІ 2010-х гг.

Дысертацыйная праблематыка беларускіх гісторыкаў у 2010-х гг. вызначалася і развівалася як працяг метадалагічнага і ідэалагічнага распрыгоньвання. Як вядома, на папярэднім часовым адрэзку адбыліся карэнныя змены на гісторыка-навуковым «фронце». У 1990-я гг. адышла ў нябыт манаполія марксісцка-ленінскай метадалогіі, замацаваўся гнасеалагічны плюралізм, ў айчынную гістарычную навуку вярнуліся забароненыя раней імёны, скасавалася абмежаванне на вывучэнне «белых плямаў» мінуўшчыны, значна пашырылася даследчая тэматыка. Даследаванні ахапілі самыя розныя вобласці, напрамкі, эпохі гісторыі.

Адначасова на хвалях свабоды даследавання стала прасочвацца пэўная метадалагічная і фактaлагічная адвольнасць. Выяўленая мадэрнізацыя, як аб'ектыўная заканамернасць гістарычных працэсаў на Беларусі, уласцівая другой палове XIX – першай палове XX стст., часам стала падмяняцца суб'ектыўна матываванай мадэрнізацыяй гістарычных ацэнак. Запатрабаваліся гады навуковых спрэчак і ўсталявання аб'ектыўнага погляду, каб на новай ступені пераасэнсаваць перажытыя падзеі, з'явы і працэсы. Зараз у беларускай гістарычнай навуцы назіраецца падобнае пераасэнсаванне.

Але пры гэтым дысертанты рэальна сталі пазбягаць асвятлення праблематыкі 50-х – 80-х гг. XX ст. Чаму ўзнікла такая даследчая лакуна? Мабыць, маладых гісторыкаў насцярожвае звышсупярэчлівасць ацэнак падзей, працэсаў і метадалагічных падыходаў да іх трактоўкі. Амплуа дадзенага гістарычнага адрэзка ім нецікавае. Сапраўды, пакуль няпроста ў рамках адной гістарычнай эпохі вызначыць і выкарыстаць даследчую метадалогію, якая б належным чынам растлумачыла сутнасць партыйных і дзяржаўных праграм развіцця СССР/БССР, увабраўшых у сабе яўную амбівалентнасць працэсаў – як пазітыў, так і негатыў, змайстраваць такое метадалагічнае «сіта», якое акажацца здольным максімальна аб'ектыўна выкласці і ацаніць фармацыйныя перавагі сацыялістычнага будаўніцтва і адначасова даказаць яго заганы ды непазбежнасць крызісу і крушэння. Як мяркуецца, за такую справу патэнцыяльна здольныя ўзяцца саіскальнікі доктарскіх ступеняў. Наспявае час для перспектыўных кандыдатаў навук распрацоўваць канцэптуальна вызначальныя, «рэперныя» моманты нагаданай эпохі.

Адначасова акрэсліліся і рэальныя тэматычныя акцэнты ў дысертацыйным адлюстраванні савецкай і сучаснай эпох гісторыя